Анализ современного публицистического процесса, журналистских текстов абсолютного большинства многократно возросших по количеству периодических изданий не обнаруживает роста их качества и, в частности, это проявляется, порою, в полном отсутствии публикаций на морально-этические темы. Не менее часто встречаются этически ненормированные тексты, особенно этим грешит, так называемая, альтернативная пресса. Это наглядно заметно при освещении «пограничных» и «знаковых» тем, касающихся государственной символики, традиционных идеалов, роли и места самой прессы в обществе и т. п.

В период трансформации идеалов и геополитического передела проблема обретает выраженный идеологический и политический окрас. В начале XXI века, в условиях эпохи открытых информационных войн, проблема морального выбора становится одной из центральных как для каждой личности в отдельности, так и в масштабах государств. Задача сложная и актуальная, требующая глубокого научного исследования и общественного осмысления для кардинального ее решения и обеспечения дальнейшего прогрессивного развития.

**Литература**


1. *Белякова В.* Этические принципы и профессиональные методы сбора информации // Беларуская журналістыка – 2004: Матэр. 61-й навук.-практ. канф. студэнтаў і аспірантаў. Мн., 2004. С. 10–11.
2. *Белякова Л. П.* Мир газетного образа. Мн., 2003. 175 с.
3. *Падаляк Т.* Мэта апраўдвае сродкі? (пра недапушчальныя метады збору інфармацыі) // Журналістыка – 2002: Матэр. 4-й Міжнар. навук.-практ. канф. Мн., 2002. С. 166–169.
4. *Сницерева Н.* Некоторые тенденции развития журналистики 30-х гг. XIX в. в контексте современности // Журналістыка – 2002: Матэр. 4-й Міжнар. навук.-практ. канф. Мн., 2002. С. 222–226.


## ПРЭСА ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.: ТЫПАЛОГІЯ ВЫДАННЯЎ


**П. Дз. Бераснеў**


### Уводзіны

Падпольны друк 1861–1864 гг. – гэта з’ява фенаменальная не толькі ў польскай гісторыі, але і ў сусветнай. Нідзе болей да гэтага часу не было такога, каб за чатыры гады пабачыла свет столькі канспіратыўных выданняў, якія б заклікалі насельніцтва да барацьбы. Але, на жаль, у нашай краіне пераважная большасць гэтага друку невядомая. Шмат на што савецкія, а потым беларускія даследчыкі не звярнулі ўвагу, далёка не ўсё абмяркоўвалася навукоўцамі (па розных прычынах), і таму так

атрымалася, што не толькі падпольная прэса, але і многія падзеі паўстання (асабліва на тэрыторыі Польшчы) так і засталіся для нас «белай плямай» гісторыі. Зыходзячы з гэтага, лічу, што вывучэнне паўстанцкага друку і вызначэнне асноўных тыпаў нелегальных і эміграцкіх выданняў пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя павінна быць цікавым не толькі для гісторыкаў, але і для журналістаў, і нават для больш шырокіх колаў грамадства.

У артыкуле разглядаюцца не толькі выданні перыяду паўстання, але і прэса «падрыхтоўчага перыяду», а таксама эміграцкі друк. Асноўныя крыніцы даследавання – зборнік тэкстаў паўстанцкіх газет «Prasa tajna z lat 1861–1864» (Вроцлаў – Варшава – Кракаў, 1966) і даведнік Януша Гансяроўскага «Bibljografja druków dotyczących powstania styczniowego 1863–65» (Варшава, 1923).

### З'яўленне нелегальнай прэсы. Працягласць выдання газет

Ажно да 1860 года першыя канспіратыўныя арганізацыі не адчувалі патрэбы ў друкаваных органах. Самае большае, што было патрэбна – гэта невялічкія, напісаныя ад рукі (нават у адным экземпляры) і перадаваемыя адзін аднаму «газеткі». Але хутка, калі тайныя згуртаванні перайшлі да масавай агітацыі, з'явілася патрэба і ў друкаваных выданнях. Падчас з'езду трох манархаў у кастрычніку 1860 года моладзь выпусціла ў свет першыя ўлёткі, якія заклікалі насельніцтва да байкоту з'езду. Гэта была першая ластаўка, за якой паследавала мноства друкаваных адозваў, улётак і брашур. 1 жніўня 1861 з'явілася першая падпольная газета – «Strażnica» («Strażnica» выходзіла на працягу 1861–1863 гг. – так доўга не праіснавала ніводная іншая паўстанцкая газета). Самы апошні нумар паўстанцкай прэсы выйшаў у ліпені 1864 года ў Галіцыі (газета «Niepodległość»).

Найбольшую ўвагу выдаўцы нелегальнай прэсы надавалі зместу, а не форме. Таму зменным быў не толькі фармат (напрыклад, экземпляры газеты «Głos Kapłana Polskiego» розняцца памерамі ў цэлых 22 см), але і колькасць старонак (пераважна газета складалася з 2–4 старонак, друк быў у адзін, два, зрэдку ў тры слупкі). З-за пастаяннага ўціску паліцыі рэдкія выданні існавалі болей за паўгода (за гэты час паспявала ўбачыць свет прыкладна каля дзесяці нумароў). Выключэннямі сталі «Strażnica», «Głos Kapłana Polskiego», «Ruch» і некаторыя іншыя.

### Колькасць выданняў і месцы выхаду прэсы

У розныя часы розныя даследчыкі называлі розныя лічбы: напрыклад, Зялінскі ў 1914 годзе налічыў 59 падпольных выданняў, Гансяроўскі ў 1923 годзе прыводзіў 62 падпольныя выданні і 33 выданні з эміграцыі, а

годам пазней Сакульскі павялічыў колькасць паўстанцкай прэсы да 69 назваў. Па месцы выхаду розняцца:

- Друк на тэрыторыі сучаснай Польшчы. Абсалютная большасць паўстанцкіх выданняў друкавалася ў Варшаве – прыкладна 37 газет. Невялікая колькасць – у Кракаве («Bicz», «Kronika», «Męczennicy», «Naprzód!», «Ojczyzna», «Polska»). «Głos bratni» – газета, у якой месцам выдання пазначаны Люблін. У навукоўцаў ёсць сумненні наконт дакладнасці гэтага факта, але калі гэта насамрэч так, «Głos bratni» можна лічыць першай пазаваршаўскай газетай.
- Літоўска-беларускі друк. Сюды можна аднесці віленскія выданні («Chorągiew swobody», «Mużyckaja Prauda», «Wiadomości o powstaniu na Litwie») і выданні ў Беластоку («Hutorka dwóch susiedou»).
- Газеты на Украіне – гэта львоўскія «Galicya», «Prawda», кіеўскія «Odrodzenie», «Partyzant» (пазней выдаваўся ў Пшэмыслі), «Ukrainiec», «Walka».
- Прэса эміграцыі прадстаўлена даволі шырокай геаграфіяй – Жэнева, Берлін, Лондан, Цюрых, Нью-Йорк і іншыя гарады, але найбольшая колькасць выданняў выходзіла ў Парыжы – 14.

**Мова выданняў**

- Абсалютная большасць газет друкавалася на польскай мове.
- На беларускай мове выходзіла 2 выданні: «Mużyckaja Prauda» і «Hutorka dwóch susiedou». Друкаваліся лацінкай.
- Газета «Wiadomości o naszej wojne z Moskalami» выходзіла на польскай і літоўскай мове, таму яе можна выдзяліць у асобны радок.
- Частка эмігранцкай прэсы выходзіла не на польскай, а на іншых заходнееўрапейскіх мовах, напрыклад, «Adler. Der weisse» на нямецкай, «Ephémérides polonaises» і «Peuple. Le – polonais» на французскай.

**Спецыялізацыя**

Па прызначэнні для розных груп насельніцтва падпольную прэсу можна ўмоўна падзяліць на наступныя катэгорыі:

- для святарства («Głos kapłana polskiego» – рэдактарамі былі ксёндз Караль Мікашэўскі і, магчыма, ксяндзы Уладзіслаў Шабраньскі, Казімір Жуліньскі, Альбін Дунаеўскі; «Dzwon duchowny»– рэдактар ксёндз К. Жуліньскі);
- для рамеснікаў і працоўных («Prawdziwy Patryota»);
- для сялянства – («Kosynier», «Mużyckaja Prauda». Дарэчы, польскія даследчыкі лічаць яе асабістым прадпрыемствам Канстанціна

Каліноўскага (па ўзгадненні з Літоўскім Правінцыяльным Камітэтам). Цікава, што ў той час, калі польскія выданні спрабавалі выклікаць у сялянства патрыятычныя пачуцці (вяртанне да межаў 1772 года і г.д., што было вельмі далёка ад патрэбаў простага люду) ды прымірыць іх з панамі, а паноў заклікалі прынесці ахвяры на карысць народа, выдаўцы «Mużyckaj Praudy» звярталіся непасрэдна да праблем, якія турбуюць кожнага селяніна, – пытанняў класавага, палітычнага і рэлігійнага прыгнёту. Не сакрэт, што ў Гродзенскай і Віленскіх губернях, дзе распаўсюджвалася «Mużyckaja Prauda», доля сялян ў агульнай колькасці паўстанцаў складала адпаведна 33 % і 27 %, а ў астатніх беларускіх губернях была значна меншай (Віцебская – 7 %, Магілёўская – 13 %, Мінская – 20 %). Таму можна сцвярджаць, што «Mużyckaja Prauda» і іншыя прапагандысцкія творы Канстанціна Каліноўскага і яго паплечнікаў (Валерыя Урублеўскага, Фелікса Ражанскага, Станіслава Сангіна) былі даволі эфектыўным сродкам агітацыі. Але нельга і перабольшваць ролю «Mużyckaj Praudy», бо яна была ўсяго толькі адной з шматлікіх паўстанцкіх газет, а вышэйшы працэнт сялян у шэрагах паўстанцаў у названых губернях можна растлумачыць адносна большай доляй каталікоў у насельніцтве Заходняй Беларусі.);

- нарэшце, выданні, разлічаныя на шырокае кола чытачоў (пераважна на панства, шляхту і буржуазію).

**Ідэйны змест выданняў**

Калі праводзіць класіфікацыю па ідэалогіі выданняў (падзяляць на «белыя» і «чырвоныя»), дык рабіць гэта трэба асобна для кожнага перыяду, бо адно і тое ж выданне ў розныя часы магло быць трыбунай для розных бакоў. Так, напрыклад, два першыя нумары «Chorągiewa swobody» (орган Літоўскага Правінцыяльнага Камітэту) былі выдадзены ў час, калі камітэтам кіраваў Кастусь Каліноўскі, а апошні – калі да ўлады ў камітэце прыйшлі «белыя».

Паслядоўна праводзілі ідэі «чырвоных» газеты «Pobudka», «Głos z Warszawy», «Głos bratni» (Люблін, 1862. Прадстаўляе праграму чырвоных у памяркоўным адценні), «Odrodzenie» (орган чырвоных на Украіне, утвораны па ініцыятыве Стэфана Баброўскага) і інш. «Белым» належалі выданні «Doniesienia z placu boju», «Doniesienia z pola bitwy», «Naprzód!», «Niepodległość», «Nowiny polityczne polskie» і шэраг іншых.

**Заключэнне**

Такім чынам, у 1861–1864 гадах, нягледзячы на жорскі ўціск з боку ўлад, на тэрыторыі Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны з’явіўся і

шырока распаўсюдзіўся падпольны друк, які, на мой погляд, прадстаўляе не «механічную сукупнаць выданняў», а адзіны комплекс агітацыйнай прэсы. Канечне, друк розніўся і тэматыкай, і спецыялізацыяй выданняў (для шляхты, сялян, духавенства, рамеснікаў і г.д.), але галоўныя мэты былі аднолькавыя ва ўсіх: аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай, адраджэнне польскага нацыянальнага адзінства, узнаўленне «пратэктарату» Польшчы над Літвой і ўсходнеславянскімі тэрыторыямі (Украінай і Беларуссю).

Амаль уся прэса друкавалася па-польску. Працягласць выдання асноўнай масы газет была невялікая – каля паўгода. Відавочна таксама, што сваю агітацыйную функцыю падпольны друк так да канца і не выканаў: не змог уцягнуць у паўстанне асноўную сацыяльную сілу тагачаснага грамадства – сялянства, бо выйсце з тупіка ўзаемаадносін «пан – халоп» так і не было знойдзена.

Другая наша выснова тычыцца феномену беларускамоўных выданняў («Mużyckaja Prauda» і «Hutorka dwóch susiedou», улёткі для сялян). Відавочна, што адэкватнае разуменне гэтай прэсы немагчыма без уліку і ведання кантэксту – польскага нелегальнага друку 1861–1864 гг., які і да сёння ігнаруецца большасцю айчынных даследчыкаў. Таму вывучэнне ўсёй сукупнасці паўстанцкіх выданняў пачатку 60 гадоў XIX стагоддзя – надзённая задача беларускіх гісторыкаў журналістыкі.

## «ДЕЛОВАЯ ПРЕССА»: ПОДХОДЫ К ОПРЕДЕЛЕНИЮ ПОНЯТИЯ

**Т. А. Горчанюк**

Социальный заказ на новое качество и содержание коммуникаций в сфере деловой жизни и рыночных отношений стал решающей предпосылкой появления деловой прессы. Сегодня деловая пресса – один из наиболее динамично развивающихся сегментов постсоветского медиарынка – все чаще привлекает внимание исследователей СМИ. Предметом изучения выступают как типологические характеристики, так и творческие ресурсы деловой прессы. Однако теоретические исследования данного феномена, охватывающие последние 15 лет, позволяют утверждать, что само понятие «деловая пресса» до сих пор не устоялось, а его границы довольно размыты. Возникает закономерный вопрос, какие издания относить к деловым и только ли печатные средства массовой информации могут претендовать на принадлежность к деловой прессе? В литературе встречаются различные варианты ответа на него.

В ходе изучения работ, посвященных деловой прессе, выяснилось, что можно выделить два основных подхода к трактовке этого понятия. Одна